**Пётра Мурзёнак: Як надоўга А. Лукашэнка?**

*Анатацыя*. На падставе незалежных апытаньняў, праведзеных падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001, 2010, 2015 і 2020 г.г., падлічаны адносны і абсалютны ўзровень падрымкі А.Лукашэнкі насельніцтвам Беларусі. Адносны сярэдні ўзровень падтрымкі не перавышаў паловы ад усёй колькасьці людзей, якія на іх галасавалі – ён склаў 42.7% і быў істотна меншым у параўнаньні з афіцыйнымі даннымі - 79.8%. Гэта розьніца сьведчыць аб значных фалісіфікацыях на гэтых выбарах – сярэдні паказчык фальсіфікацый склаў 37.1%. Тое ж можна казаць і пра абсалютны ўзровень падтрымкі дыктатара - за яго ў сярэднім прагаласавалі крыху больш 2.6 млн з 6.1 млн людзей, што прымалі ўдзел у галасаваньні. Паводле нашых разьлікаў каля 3.5 млн выбарцаў былі “не” за А.Лукашэнку - гэта большая частка насельніцтва складае магчымы пратэстны патэнцыял, які можа раскрыцца з цягам часу і пры адпаведных зьнешніх умовах.

Хтосьці можа сказаць, што ў Беларусі пануе дэмакратыя, усё ціха і спакойна, утульна і стабільна. Народ вольны, галасуе, прымаюцца рашэньні...

У адным з даўніх нумароў “Нашай Нівы” зьмешчана інтэрв’ю былога беларускага дысідэнда М. Кукабакі (25.04.2014), дзе выказана думка, што Лукашэнка з’яўляецца найлепшым у абароне суверэнітэта Беларусі пакуль у Расіі кіруе Пуцін. Магчыма, што многія людзі дагэтуль падзяляюць такую думку і прызнаюць існаваньне “феномена Лукашэнкі”.

Сапраўды, многія не могуць дакладна зразумець, як таму ўдаецца “даіць” Расію і не прымаць прамога ўдзелу ў вайне разам са сваім “б...м саюзнікам” супраць Украіны? У бытнасьць былога міністра замежных спраў Ул. Макея (1958-2022), прадпрымаліся спробы шукаць альтэрнатыўныя падыходы (не зьвязаныя з Расіяй), да прыкладу, увядзеньне Беларусьсю 5-дзённага, а затым 30-дзённага бязьвізавага ўезду у краіну (2017-2018). Але А.Лукашэнку доўга так балансаваць не ўдасца, калі яго ўрад сапраўды імкнецца зьберагчы суверэнітэт і незалежнасьць краіны - бо гэта патрабуе больш рашучых крокаў для таго, каб дыстанцыявацца падалей ад Расіі і такім чынам пачувацца бясьпечным. Рыторыка дыктатара аб тым, што беларускае войска не будзе ўдзельнічаць у ваенных дзеяньнях супраць Украіны ні для каго ня ёсьць пераканаўчай.

Калі вайна Расіі супраць Украіны пярэйдзе ў хранічную фазу - на выжыванне – то Лукашэнка – хутчэй за ўсё - за - ста – е - цца!? Створаная ім, рэпрэсіўная і лаяльная яму ўлада даволі моцная – у дадатак, тут і выхад на палітычную сцэну руху\партыі “Белая Русь”, тут і Нацыянальны сход Беларусі. Можна не сумнявацца - як(!) гэтыя палітычныя інстытуцыі будуць працаваць – мяркую, што такім жа чынам, як функцыянуе выбарчая сістэма, якую часова ўзначальвала сп.Ярмошына, а зараз, здаецца, чалавек па прозьвішчу Карпенка.

Другое пытаньне, якое натуральна ўзнікае - А які абсалютны ўзровень падтрымкі А.Лукашэнкі насельніцтвам Беларусі? У разьлікі мы ўзялі даступныя лічбы з выбараў 2001, 2010, 2015 і 2020 года, пералічаныя паводле сацыялагічных апытаньняў (Табліца). Для параўнаньня даём спасылку на лічбы па выбарах прэзідэнта ў 1994 годзе.[1]

**Табліца. Узровень адноснай і абсалютнай падтрымкі\непадтрымкі А.Лукашэнкі на чатырох прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі**

| Год | Усяго галасавала | з іх “за” Лукашэнку | | | | з іх не за Лукашэнку (розьніца між усімі прагаласаваўшымі і тымі, хто быў “за” паводле апытаньняў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | %, афіцыйна | абсалютная колькасць чалавек | %, паводле апытаньняў | абсалютная колькасць чалавек | |
| **2001** | 6.173.835 | 75.7 | 4.666.680 | 57.5* | 3.549.955 | 2.623.880 |
| **2010** | 6.444.031 | 79.7 | 5 130 557 | 51.1* | 3.292.890 | 3.151.141 |
| **2015** | 6.113.013 | 83.5 | 5 102 478 | 40.6* | 2.481.883 | 3.631.130 |
| **2020** | 5.818.955 | 80.1 | 4 661 075 | 21.5** | 1.251.075 | 4.567.880 |
| **Сярэдняе** | **6.137.459** | **79.8%** | **4.890.198** | **42.7%** | **2.643.951** | **3.493.508** |

* - *зьвесткі НІСЭПД; ** - апытаньне “Народный опрос”.*

З аналізу адносных лічбаў на ўказаных выбарах “за” А.Лукашэнку ніяк не атрымоўваецца нават палавіны (42.7% паводле апытаньняў супраць афіцыйных 79.8%)?! З гэтых лічбаў вынікае высокі ўзровень фальсіфікацый – 37.1% (79.8%-42.7%).

---

[1] 1994: У I туры з 5.904.312 чалавек, хто галасаваў, за Лукашэнку было - 44.82% галасоў або 2.646.312 чалавек; у другім туры – 80.3% і 4.241.026 галасоў. Відавочна, што за Лукашэнку ў II-м туры дадаліся каля 1.6 мільёнаў галасоў, і яны йшлі ад усіх астатніх кандыдатаў – бо, напрыклад, В.Кебіч у II-м туры не зьбярог, а нават страціў 270 тыс. галасоў – з 1.02 млн да 0.75 млн; у I туры З.Пазьняк меў 757 тыс., С.Шушкевіч – 585 тыс,, А.Дубко – 353 тыс., В.Новікаў – 253 тыс.  (у першым туры галасавалі 5.904.312 чалавек, у II-м - 5 278 331).

Паводле апытаньняў, абсалютныя лічбы прыхільнікаў А.Лукашэнкі, за выключэньнем выбараў 2020 года, былі больш-менш стабільнымі, і вагаліся між 2.5 і 3.5 млн чалавек, а сярэдняе з тых хто галасаваў склала 2.643.951 цьвёрдых прыхільнікаў Лукашэнкі – гэта і ёсьць яго электарат – і гэта менш паловы ад людзей, якія галасавалі (!).

Можна дапусьціць, што электарат[2] Лукашэнкі мог значным чынам зьмяніцца на выбарах 2020 года ў параўнаньні з 2015 годам. Але не ў такой ступені, як гэта ацэнівалі многія інтэрнэт-рэсурсы, якія, на мой погляд, не маглі ў поўнай меры адпавядаць навукова-абгрунтаваным падыходам у правядзеньні саміх апытаньняў. Тыя “3%”, якія гэтыя інтэрнэт-рэсурсы атрымалі за А.Лукашэнку, даюць толькі 174.569 галасоў ад 5.818.955, хто прымаў удзел у галасаваньні ў 2020 годзе – але ... у 2015 годзе за А.Лукашэнку паводле незалежных апытаньняў яшчэ было амаль 2.5 мільёны чалавек.

Калі прыкінуць яшчэ, то значыць, што ўсе астатнія людзі, што прымалі ўдзел у гэтых галасаваньнях адназначна былі не за Лукашэнку, а гэта прыблізна каля 3.5 млн чалавек (6.137.459 - 2.643.951 = 3.493.508). Я ў большай ступені давяраю апытаньням праведзеным “Народным опросом”, якія далі ў 2020 годзе 21.5% за А.Лукашэнку – гэта 1.251.075 галасоў ад 5.818.955, хто прымаў удзел у галасаваньні. Параўнаўшы лічбы галасоў за Лукашэнку ў дынаміцы – ***3.549.955 (2001) - 3.292.890 (2010) - 2.481.883 (2015) - 1.251.075 (2020)***, мы адзначаем рэзкае падзеньне яго падтрымкі ў 2020 годзе, якое магло здарыцца толькі па нейкіх аб’ектыўных прычынах. Мяркую, што тыя ж самыя прычыны выклікалі небывалы пад’ём самапавагі і гонару беларусаў падчас “Рэвалюцыі Надзеі - 2020” (недастатковая роля дзяржавы ў барацьбе з кавідам, барацьба ўладаў з тунеядцамі, стомленасьць насельніцтва ад дыктатара). Такім чынам, прыведзеныя разлікі сьведчаць аб тым, што А. Лукашэнка не мае і абсалютнай падтрымкі ў насельніцтва.

Беларускі народ знаходзіцца зараз, пасьля паразы Рэвалюцыі-20202, у стане страху і летаргічнага сну. Ці магчыма зьмена палітычнага і эканамічнага вектару Беларусі пасьля больш чым 30-гадовай “мяккай каланізацыі” Беларусі Расіяй? Відавочна, што Расія зацікаўлена працягваць тую ж палітыку, і нават больш таго, інтэграваць Беларусь у свой склад. Аб гэтым Пуцін не перастае падаваць сігналы – аб далучэньні

[2] Я не прыхільнік называць людзей, якія падтрымоўваюць Лукашэнку “ябацькамі” – лічу няправільным даваць такі ярлык для значнай часткі беларусаў, якія маюць іншую думку, тым больш, што такі ярлык можа быць абразлівым.

да Расіі шасьцю беларускімі губернямі (2005) ці гаворыць аб стварэньні адзінай фінансавай і грашовай сістэмы - пасьля “глыбокай” эканамічнай інтэграцыі (2024).[3]

Цалкам зразумела, што рэжым Лукашэнкі не зможа “эканамічна” выжываць без дапамогі Расіі – гэта паказалі як адсутнасьць істотных эканамічных рэформаў у Беларусі на працягу 30 гадоў кіраваньня Лукашэнкі, так і палітыка-эканамічная падтрымка рэжыма Расіяй як да, так падчас і пасьля “Рэвалюцыі надзеі – 2020”. Зьмена сітуацыі ў Расіі, напрыклад, адхіленьне ад улады Пуціна, наўрад ці памяняе існуючую каланіяльную палітыку Расіі ў дачыненьні да Беларусі. Хіба што татальнае паражэньне Расіі ў вайне з Украінай можа прывесьці і да кардынальных зьмен у Беларусі – аж да зьвяржэньня з трона А.Лукашэнкі.[4]

***Высновы:***

1. На прэзідэнцкіх выбарах 2001, 2010, 2015 і 2020 г.г. адносны ўзровень падрымкі А.Лукашэнкі не перавышаў паловы ад усёй колькасьці людзей, якія на іх галасавалі - сярэдні працэнт людзей, падтрымаўшых дыктатара на ўказаных чатырох выбарах, склаў 42.7% супраць афіцыйных 79.8%.
2. Сярэдні ўзровень фалісіфікацый на гэтых выбарах быў высокім і дасягнуў 37.1% (79.8%-42.7%).
3. Натуральна, абсалютны ўзровень падтрымкі на чатырох выбарах быў таксама меншым за палову – за А.Лукашэнку прагаласавалі каля 2.6 млн з 6.1 млн людзей, што прынялі ўдзел у галасаваньні. Электарат Лукашэнкі на ўказаных выбарах вагаўся між 2.5 млн і 3.5 млн.
4. Паводле нашых разьлікаў каля 3.5 млн выбарцаў былі “не” за А.Лукашэнку. Гэта большая частка насельніцтва складае магчымы пратэстны патэнцыял, які можа раскрыцца з цягам часу і пры адпаведных зьнешніх умовах.

[3] Ответы на вопросы российских журналистов. В завершение рабочего визита в Астану Владимир Путин ответил на вопросы представителей российских СМИ. 4 июля 2024 года. http://kremlin.ru/events/president/news/74469

[4] Паслабленьне зьнешняга ціску (Расіі, Германіі, Польшчы) заўжды спрыяла развіцьцю цывілізацыйных працэсаў у Беларусі.

**Piotra Murzionak: How long will A. Lukashenko be in power?**
***(web-magazine "Culture. Nation", issue 34, November 2024, 65-69, www.sakavik.net)***

*Abstract*. Based on independent polls conducted during the presidential elections of 2001, 2010, 2015 and 2020, the relative and absolute level of support for A.Lukashenka by the population of Belarus was calculated. The relative average level of support did not exceed half of the total number of people who voted there - it was 42.7% and was significantly lower compared to the official data - 79.8%. The difference found indicates significant falsifications in these elections – their average rate was 37.1%. The same can be said about the absolute level of support for the dictator - on average, slightly more than 2.6 million of the 6.1 million people who took part in the elections voted for him. According to our calculations, about 3.5 million voters were "not" for A.Lukashenka - this majority of the population represents a possible protest potential that can unfold over time and under appropriate external conditions.

**Пётра Мурзёнак: Сколько продержится А. Лукашенко?**
***(веб-журнал "Культура. Нация", вып. 34, ноябрь 2024, 65-69, www.sakavik.net)***

*Аннотация*. На основе независимых опросов, проведенных в ходе президентских выборов 2001, 2010, 2015 и 2020 годов, был рассчитан относительный и абсолютный уровень поддержки А.Лукашенко населением Беларуси. Относительный средний уровень поддержки не превышал половины от общего числа проголосовавших - он составлял 42,7% и был существенно ниже официальных данных - 79,8%. Таким образом, средний рассчитаный процент фальсификаций составил 37.1%. То же самое можно сказать и об абсолютном уровне поддержки диктатора - в среднем за него проголосовали чуть более 2,6 млн из 6,1 млн человек, принявших участие в голосованиях. По нашим подсчетам, около 3,5 млн избирателей были "не" за А.Лукашенко - эта большая часть населения представляет собой возможный протестный потенциал, который может раскрыться со временем и при соответствующих внешних условиях.